**Установа адукацыі**
**«Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут**
**імя А.Д. Сахарава»**
**Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Дырэктар МДЭІ імя А.Д.Сахарава БДУ

_________________ А. І. Родзькін

23 красавіка 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД-1504-24/вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці:**

**6-05-0511-04 Медыка-біялагічная справа**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове АСВА 6-05-0511-11-2023 ад 04.08.2023, і вучэбных планаў установы адукацыі для спецыяльнасці 6-05-0511-04 Медыка-біялагічная справа рэг. №154-23/ вуч. ад 07.04.2023, рэг. №155-23/ вуч. інт. з. ад 07.04.2023.

СКЛАДАЛЬНІК:
*Н. М. Даўгулевіч,* загадчык кафедры лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:
*Т.Р. Кавалёва*, прафесар кафедры сучасных моў ДУА «Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Беларусі», кандыдат філілігічных навук, дацэнт;
*А.Г. Чарнецкая*, загадчык кафедры агульнай біялогіі і генетыкі ўстановы адукацыі «Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:
Кафедрай лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 10 ад 07. 03. 2024 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 8 ад 23. 04. 2024 г.).

# Тлумачальная запіска

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Беларуская мова» прызначана для ажыццяўлення навучання вышэйшай адукацыі ў межах цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Асноўныя кірункі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў ва ўстанове вышэйшай адукацыі – гэта фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыянальна-вартасным і сацыяльна-творчым вопыце, што забяспечваюць вырашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач і функцый.

Беларуская мова – дысцыпліна, якая дапамагае студэнтам далучыцца да багаццяў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі і інш.Праграма курса накіравана на засваенне і прафесійнае прымяненне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць розную інфармацыю на беларускай мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць любую думку, спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Падчас вывучэння беларускай мовы студэнты павінны засвоіць наступныя *кампетэнцыі:* авалодаць базавымі навыкамі камунікацыі ў вуснай і пісьмовай формах на беларускай мове для вырашэння задач міжасобаснага і міжкультурнага ўзаемадзеяння і вытворчых задач; быць здольным адэкватна ўспрымаць прафесійна-арыентаваныя тэксты, аналізаваць навуковую галіновую інфармацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні; выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовыў прафесійнай дзейнасці; выкарыстоўваць на практыцы паняційна-катэгарыяльны апарат, прыняты ў сферы спецыяльнасці ў галіне біялогіі і медыцыны, у тым ліку на замежнай мове.

***Мэты вучэбнай дысцыпліны:***

- выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага выкарыстання вуснай і пісьмовай мовай;
- развіваць моўна-эстэтычны густ студэнтаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы;
- пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;
- фарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;
- выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пацуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны:***

- сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;
- даць студэнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;
- дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;
- садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы функцыянавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

***ведаць:***

- ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;
- функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;
- месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;
- сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;
- поўны набор прафесійнай лексікі;
- тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці.

***умець:***

- граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай;
- адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;
- перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна-арыентаваныя тэксты;
- складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні і г. д.

***валодаць:***

- навыкамі моўнай дзейнасці ў сістэме функыянальна-стылявых разнавіднасцей беларускай літаратурнай мовы;
- метадамі і прыёмамі аналізу прафесійна-арыентаванай літаратуры з пункта гледжання беларуска-рускага білінгвізму;
- методыкай адэкватнага беларуска-рускага і руска-беларускага перакладу прафесійных тэкстаў;
- пісьмовымі і вуснымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

На вывучэнне дысцыпліны адводзіцца 106 гадз.: 42 гадз. – аўдыторныя заняткі, з іх 42 гадз. – практычныя, для завочнай скарочанай формы навучання: 10 гадз. – аўдыторныя заняткі, з іх 10 – практычныя.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік у 4-м семестры для дзённай формы навучання, для завочнай скарочанай формы навучання – залік у 6-м семестры.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая, завочная скарочаная. Працаёмістаць дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

## Змест вучэбнага матэрыялу

| | |
|---|---|
| **Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова»** | Прадмет і задачы курса. Месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яго сувязь з іншымі дысцыплінамі |
| *Тэма 1.* **Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей** | Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Мова як сацыяльная з'ява. Гіпотэзы паходжання мовы. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў. Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV-XVI ст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Новая (сучасная) беларуская мова XIX- пачатку XX ст. Беларуская мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX – пачатку XXI ст. |
| *Тэма 2.* **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная). Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.<br>Паняцце тэрміна. Слова і словазлучэнне ў ролі тэрміна. Тэрміналогія. Галіновы тэрміналагічныя сістэмы. Узаемасувязь тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікі (Тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Гісторыя беларускай навуковай тэрміналогіі. Асноўныя прынцыпы яе выпрацоўкі ў 20-30-я гг. XX ст. Крыніцы фарміравання беларускай тэрміналогіі. Роля жывой народнай мовы ў складванні і развіцці беларускай |

| | |
|---|---|
| | тэрміналагічнай лексікі. Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе. Гісторыя беларускай тэрміналагічнай лексікаграфіі. Тэрміналагічная лексіка 20-30-х і 90-х гадоў XX ст. Тыпы слоўнікаў. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэме беларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў. |
| *Тэма 3.* **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму** | Паняцце білінгвізму і інтэрферэнцыі. Арфаэпічныя і марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы (назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, дзеяслоў і яго формы, прыслоўе). Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы.<br>Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі. Паняцце моўнай нормы. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім. Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Назоўнік. Несупадзенне ў родзе, ліку, скланенні. Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў. Прыметнік. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных формаў у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннік і лічэбнік. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі. Дзеяслоў. Спецыфіка спражэння. Ужыванне суфіксаў дзеясловаў. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеясловы. Асаблівасці іх утварэння і ўжывання ў беларускай мове. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў у складзе тэрміналагічных словазлучэнняў пры перакладзе на беларускую мову. Прыслоўе. |

| | |
|---|---|
| | Асаблівасці ўтварэння і ўжывання формаў ступеней параўнання ў адрозненне ад рускай мовы. Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка. |
| *Тэма 4*. **Функцыянальныя стылі маўлення** | Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў. Навуковы стыль і яго падстылі. Афіцыйна-справавы стыль і яго падстылі. Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асблівасці. Узаемапранікненне стыляў. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя стыляў (навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны). Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы, навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці. Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго характэрныя асаблівасці. Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. Узаемапранікненне стыляў. |
| *Тэма 5*. **Навуковы стыль** | Асноўныя рысы навуковага стылю. Моўныя сродкі навуковага стылю. Паняцце аб падмове навук. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю. Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне. Цытаты і спасылкі, іх афармленне. Пераклад на беларускую мову навуковых тэкстаў. Асноўныя стылі навуковага стылю (падрыхтаванасць маўлення, пераважна яго пісьмовая форма ў выглядзе маналогу, лагічная паслядоўнасць выказвання, сціслая пры інфарматыўнай насычанасці зместу). Моўныя сродкі навуковага стылю (насычанасць тэрмінамі, перавага абстрактнай лексікі, пераважнае ўжыванне назоўнікаў, пашыранасць формы роднага |

| | |
|---|---|
| | склону, асаблівая функцыя займенніка мы, шырокае выкарыстанне дзеепрымеінікаў і дзеепрыслоўяў, пашыранасць складаазалежных сказаў з аднароднымі членамі, пабочнымі словамі і ўстаўнымі канструкцыямі, сродкі лагічнай сувязі паміж сказамі і інш.). Паняцце аб падмове навук: біялогіі. хіміі, эканомікі, права, экалогіі і г.д. Рэальны слоўнік кожнай падмовы. Выкарыстанне невербальных сродкаў (табліцы, графікі, схемы). Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, рэзюме і інш.), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення. Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне. Рубрыкацыя навуковага тэксту. Абзац як структурная адзінка тэксту. Цытаты і спасылкі, іх афармленне. |
| *Тэма 6.* **Афіцыйна-справавы стыль** | Асноўныя рысы афіцыйна-справавога стылю. Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю. Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная і тлумачальная запіскі і інш.). Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў. Асноўныя рысы афіцыйна-справавога стылю (пераважна пісьмовая форма функцыянавання, уніфікаванасць і стандартызаванасць мовы дакументаў, дакладнасць фармулёвак, лагічнасць маўлення, экспрэсіўная нейтральнасць, монасемічасць лексікі). Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю (шырокае выкарыстанне наменклатурных назваў, пашыранасць аддзеяслоўных назоўнікаў, у тым ліку з прэфіксам не-, ужыванне назваў асобы паводле сацыяльнага становішча і сферы дзейнасці ў форме мужчынскага роду, абмежаванае выкарыстанне займеннікаў, пашыранасць інфінітыва, спецыфіка дзеяслоўнага кіравання, расшчапленне выказніка, рэгламетацыя |

| | |
|---|---|
| | парадку слоў у сказе, канструкцыя са складанымі злучнікамі і адыменнымі прыназоўнікамі. Выкарыстанне безасабовых канструкцый). Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, справавыя пісьмы і інш.), правілы іх напісання і афармлення. Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тэксту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў. |
| *Тэма 7.* **Культура прафесійнага маўлення** | Мова і маўленне. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Паняцце культуры маўлення. Правільнасць маўлення і моўныя нормы. Тэхніка і выразнасць маўлення. Узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў маўленчай дзейнасці. Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Маўленчы этыкет і культура зносін. Мова і маўленне. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне. Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць. Правільнасць маўлення і моўныя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя).<br>Тыповы маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення. Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.). Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці. Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення. Маўленчы этыкет і культура зносін. |

# Вучэбна-метадычная карта для дзённай формы навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КРС | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова”.** | | 2 | | | | | |
| 1.1. | **Прадмет і задачы курса.** | | 2 | | | | | |
| **2.** | **Беларуская мова і яе месца у сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.** | | 4 | | | | | |
| 2.1. | **Мова і соцыум.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.2. | **Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| **3.** | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.** | | 6 | | | | | |
| 3.1. | **Лексіка беларускай мовы паводле паходжання, актыўная і пасіўная лексіка, агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 3.2. | **Тэрміналогія. Паняцце тэрміна.** | | 2 | | | | | Складанне гласарыя па спецыяльнасці |
| 3.3. | **Гісторыя беларускай навуковай тэрміналогіі і лексікаграфіі.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| **4.** | **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму** | | 16 | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1. | **Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі. Паняцце моўнай нормы.** | | 4 | | | | | Вуснае апытанне |
| 4.2. | **Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.** | | 2 | | | | | Тэставыя заданні |
| 4.3. | **Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Назоўнік. Прыметнік. Займеннік, лічэбнік. Дзеяслоў.** | | 8 | | | | | Тэставыя заданні |
| 4.4. | **Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы.** | | 2 | | | | | Тэставыя заданні |
| **5.** | **Функцыянальныя стылі маўлення** | | **2** | | | | | |
| 5.1. | **Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя стыляў.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| **6.** | **Навуковы стыль.** | | **4** | | | | | |
| 6.1. | **Асноўныя моўныя сродкі і рысы навуковага стылю.** | | 2 | | | | | Пераклад навуковывх тэкстаў па спецыяльнасці. |
| 6.2. | **Жанры навуковай літаратуры.** | | 2 | | | | | Складанне тэзісаў і рэзюмэ да прапанаваных тэкстаў |
| 7. | **Афіцыйна-справавы стыль.** | | **4** | | | | | |
| 7.1. | **Асноўныя моўныя сродкі і рысы афіцыйна-справавога стылю.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.2. | **Віды афіцыйна-справавых тэкстаў.** | | 2 | | | | | Стварэнне афіцыйна-справавых папер (напісанне заяў, аўтабіяграфіі інш.) |
| **8** | **Культура прафесійнага маўлення.** | | **4** | | | | | |
| 8.1. | **Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 8.2. | **Маўленчы этыкет і культура зносін.** | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| | **Усяго** | | **42** | | | | | |
| | | | | | | | | |

## Вучэбна-метадычная карта для завочнай скарочанай формы навучання

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КРС | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| **1.** | **Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова”.** | | 1 | | | | | |
| 1.1. | **Прадмет і задачы курса.** | | | | | | | |
| **2.** | **Беларуская мова і яе месца у сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей.** | | 1 | | | | | |
| 2.1. | **Мова і соцыум.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| 2.2. | **Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| **3.** | **Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы.** | | 2 | | | | | |
| 3.1. | **Лексіка беларускай мовы паводле паходжання, актыўная і пасіўная лексіка, агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| 3.2. | **Тэрміналогія. Паняцце тэрміна.** | | | | | | | Складанне гласарыя па спецыяльнасці |
| 3.3. | **Гісторыя беларускай навуковай тэрміналогіі і лексікаграфіі.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| **4.** | **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму** | | 2 | | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1. | **Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі. Паняцце моўнай нормы.** | | | | | | Вуснае апытанне |
| 4.2. | **Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.** | | | | | | Тэставыя заданні |
| 4.3. | **Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Назоўнік. Прыметнік. Займеннік, лічэбнік. Дзеяслоў.** | | | | | | Тэставыя заданні |
| 4.4. | **Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы.** | | | | | | Тэставыя заданні |
| 5. | **Функцыянальныя стылі маўлення** | | 1 | | | | |
| 5.1. | **Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя стыляў.** | | | | | | Вуснае апытанне |
| 6. | **Навуковы стыль.** | | 1 | | | | |
| 6.1. | **Асноўныя моўныя сродкі і рысы навуковага стылю.** | | | | | | Пераклад навуковых тэкстаў па спецыяльнасці. |
| 6.2. | **Жанры навуковай літаратуры.** | | | | | | Складанне тэзісаў і рэзюмэ да прапанаваных тэкстаў |
| 7. | **Афіцыйна-справавы стыль.** | | 1 | | | | |
| 7.1. | **Асноўныя моўныя сродкі і рысы афіцыйна-справавога стылю.** | | | | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.2. | **Віды афіцыйна-справавых тэкстаў.** | | | | | | | Стварэнне афіцыйна-справавых папер (напісанне заяў, аўтабіяграфіі інш.) |
| **8** | **Культура прафесійнага маўлення.** | | **1** | | | | | |
| 8.1. | **Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| 8.2. | **Маўленчы этыкет і культура зносін.** | | | | | | | Вуснае апытанне |
| | **Усяго** | | **10** | | | | | |

## Інфармацыйна-метадычная частка

### *Рэкамендаваная літаратура*

*Асноўная*

1. Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Экалагічны профіль : вучэб. дапам. / М. М. Круталевіч [інш.] ; пад рэд. М.М. Круталевіча. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2020. – 283 с.

*Дадатковая*

1. Беларускі правапіс : дапам. / І. Л. Бурак [і інш.] ; пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : ТетраСистемс, 2012. – 224 с.
2. Куліковіч, У.І. Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя заданні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі : вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. – Мінск : Новое знание, 2011. – 504 с.
3. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2008. – 144 с.
4. Сомин, А. А. Белорусский язык. Самоучитель / А. А. Сомин. – М.: Живой язык, 2017. – 224 с.

*Слоўнікі*

1. Беларускі арфаграфічны слоўнік / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Л. П. Кунцэвіч, І. У. Кандраценя; пад рэд. А. А. Лукашанца. – 2-е выд., выпр. – Мінск: Беларус. навука, 2010.
2. Беларуска-рускі слоўнік. У 3 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; пад рэд. А. А. Лукашанца. – 4-е выд. – Мінск : БелЭн, 2012.
3. Граматычны слоўнік назоўніка / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ., філ. «Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы»; уклад. Г. У. Арашонкава [і інш.]; навук. рэд. В. П. Русак. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Беларус. навука, 2013.
4. Слоўнік беларускай мовы / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. Н. П. Еўсіевіч [і інш.]; навук. рэд. А. А. Лукашанец, В. П. Русак. – Мінск: Беларус. навука, 2012.
5. Андрыеўская, З. Руска-беларускі фізіка-геаграфічны слоўнік / З. Андрыеўская, І. Галай. – Мінск : Народная асвета, 1994. – 367 с.
6. Ахоўныя расліны Беларусі / Ю. А. Бібікаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1984. – 109 с.
7. Блакітная кніга Беларусі. Водныя аб’екты Беларусі : энцыкл. / Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1994. – 415 с.
8. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў : у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1999. – 2 т.

9. Геаграфія ў тэрмінах і паняццях : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2003. – 348 с.

10. Калугін, А. С. Тэрміналагічны беларускі-рускі слоўнік па анатоміі і фізіялогіі чалавека і жывёл для студэнтаў біялагічнага і фізкультурнага факультэта / А. С. Калугін. – Гомель : ГДУ, 1994. – 51 с.

11. Кароткі руска-беларускі тлумачальны слоўнік па агульнай біялогіі / Беларус. дзярж. пед. ун-т; уклад.: М. Д. Лісаў [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 1994. – 157 с.

12. Кароткі руска-беларускі слоўнік біялагічнай тэрміналогіі / склад. Т. М. Царэнка. – Віцебск : Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, 1994. – 76 с.

13. Кароткі руска-беларускі слоўнік фізічных і матэматычных тэрмінаў / склад. Р. Р. Кароткін; пад рэдакцыяй В. П. Маісеенкі. – Віцебск : Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, 1992. – 12 с.

14. Кароткі тлумачальны слоўнік тэрмінаў па мікрабіялогіі / склад. Р. У. Тузава, К. М. Панюціч. – Мінск : МДПІ, 1991. – 12 с.

15. Лаўшук, А. Руска-беларускі слоўнік фізічных тэрмінаў / А. Лаўшук, В. Кротаў. – Магілёў : Выд-ва МагДПІ, 1993. – 53 с.

16. Ляўшук, А. Беларуска-рускі тэрміналагічны тлумачальны слоўнік па батаніцы і кветкаводстве / А. Лаўшук, В. Кротаў. – Мінск : БДТУ, 1996. – 54 с.

17. Міксюк, Р. В. Тэрміналагічны тлумачальны беларуска-рускі слоўнік па экалогіі і лесазнаўству : для студэнтаў спец. 31.12, 26.01 : вучэб. дапам. / Р. В. Міксюк / Беларус. тэхнал. ін-т. – Мінск : БТІ ім. С. М. Кірава, 1992. – 65 с.

18. Падручны руска-беларускі слоўнік біялагічных тэрмінаў / аўт.-склад. І. Л. Бурак, Т. П. Піліповіч / Беларус. дзярж. ун-т, каф. беларус. мовы і літаратуры для прыродазнаўчых фак. – Мінск : БДУ, 1992. – 88 с.

19. Радкевич, В. А. Биологическая терминология и номенклатура : словарь русско-белорусско-латинский, белорусско-русский / В. А. Радкевич, Л. М. Вардомацкий, А. А. Лешко. – Минск : Выш. шк., 1993. – 478 с.

20. Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі / Ін-т мовазн. імя Я. Коласа АН Беларусі; склад. Г. У. Арашонкава. – Мінск : Ураджай, 1994. – 560 с.

21. Руска-беларускі слоўнік хімічных тэрмінаў / уклад.: І. А. Семяновіч [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 1995. – 30 с.

22. Русско-белорусский словарь. Руска-беларускі слоўнік : в 3 т. / Нац. академия наук Беларуси, Ин-т языка и лит.; под ред. А. А. Лукашанца. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2012. – 3 т.

23. Русско-белорусский терминологический словарь по физической географии / сост. Б. Н. Гурский, А. М. Баско. – Минск, 1990. – 64 с.

24. Савіцкі, М. І. Тлумачальны слоўнік па інфарматыцы : беларускі класічны правапіс : больш за 3000 слоў / М. І. Савіцкі. – Мінск : Медыял, 2014. – 415 с.

25. Слоўнік беларускай мовы / Нац. акадэмія навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; нав. рэд.: А. А. Лукашанец, В. П. Русак. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 916 с.

26. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад.: І. Л. Капылоў [і інш.]; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Беларуск. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.

27. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад аг. рэд. К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.

28. Тэрміналагічны тлумачальны беларуска-рускі слоўнік па лясной фітапаталогіі : для студэнтаў спец. Т.16.02 / склад.: Я. С. Раптуновіч, Р. В. Міксюк; навук. рэд. праф. М. І. Фёдараў / Беларус. дзярж. тэхнал. ун-т, каф. лесаахова і сад.-парк. буд-ва. – Мінск : БДТУ, 1995. – 26 с.

29. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь : рэдкія і тыя, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення віды жывёл і раслін / Дзярж. кам. Рэсп. Беларусь па экалогіі, АН Беларусі. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1993. – 559 с.

30. Экалагічны слоўнік: каля 1000 асноўн. тэрмінаў і паняццяў / уклад.: Л. В. Камлюк [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 2004. – 287 с.

31. Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1983–1986. – Т. 1–5.

### *Праграмнае забеспячэнне*

1. Праграма для відэаканферэнцый з функцыяй дошкі.
2. Відэапрайгравальнік VLC.
3. Відэапрайгравальнік KMP-player.
4. Foxit reader.
5. Viber.
6. Telegram.

### *Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці*

1. Тэставае апытанне.
2. Кантрольная работа.
3. Пісьмовыя навуковыя пераклады.
4. Вусныя паведамленні і рэфераты.

### *Інавацыйныя падыходы ў выкладанні*

1. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца метад вучэбнай дыскусіі, які прадугледжвае удзел студэнтаў у мэтанакіраваным абмене меркаваннямі, ідэямі, думкамі для ўзгаднення існуючых пазіцый па пэйнай праблеме. Выкарыстанне метаду забяспечвае з’яўленне новага ўзроўню

разумення і вывучанай тэмы, выкарыстанне ведаў, тэорый, канцэпцый пры рашэнні праблем, вызначэнне спосабаў іх рашэння.

2. Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваюцца метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення, якія ўяўляюць сабой сістэму, што фарміруе навыкі работы з інфармацыяй у працэсе чытання і пісьма; разуменне інфармацыі як першага, а не канцавога пункту крытычнага мыслення

## Пратакол узгаднення вучэбнай праграмы з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

Дысцыпліна “Беларуская мова” не патрабуе ўзгаднення з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці.

**Дапаўненні і змяненні да вучэбнай праграмы на 2025-2026 вучэбны год**

| № п / п | Дапаўненні і змяненні | Падстава |
|---|---|---|
| 1 | Дапоўніць тлумачальную запіску наступным:<br>У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі прафесійнай камунікацыі, але і развіць свой каштоўнаасобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны. | Удасканальванне выхаваўчай часткі вучэбнай работы. |
| 2 | ЭУМК «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для ўсіх спецыяльнасцей інстытута. | Удасканальванне вучэбна-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу. |

Вучэбная праграма перагледзена і адобрана на пасяджэнні кафедры лінгвістычных дысцыплін і міжкультурных камунікацый (пратакол №11 от 27.06.2025 г.).

Загадчык кафедры



Н.М. Даўгулевіч